# Старажытныя камяні як крыніца вывучэння гісторыі Вілейшчыны

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
***Валынец Я.А., 1 к., 22 гр., ЛФ***
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – дацэнт Стасевіч М.П.

Навукова-даследчая праца "Старажытныя камяні як крыніца вывучэння гісторыі Вілейшчыны" дазволіць убачыць старажытную гісторыю Вілейшчыны, далучыцца да міфалагічных і фальклорных звестак аб сваім краі, аб сваёй малой радзіме.

Мэта даследвання: паглыбіць веды па старажытнай гісторыі роднага краю, абапіраючыся на інфармацыю, атрыманую ў выніку даследавання камянёў-валуноў Вілейшчыны.

На тэрыторыі Вілейшчыны размяшчаюцца валуны, якія прынесены сожскім ледавіком з розных месцаў Фенаскандыі прыкладна 220–150 тыс. гадоў таму назад. Даследаванні іх складу і размеркаванне на паверхні дазваляюць вызначыць месцы, адкуль яны прынесены (жыўляючыя правінцыі). Сярод ледніковых валуноў асобна адзначаны такія, што складзены пародамі, якія сустракаюцца ў Фенаскандыі толькі на пэўнай і адзінай абмежаванай плошчы. Гэтыя валуны называюць "кіроўнымі", і яны дазваляюць вырашаць шмат навуковых праблем і пытанняў. З асобнымі камянямі звязаны легенды і паданні.

Першымі даследаваць валуны на Вілейшчыне пачалі А. Сапуноў і В.Друцка-Любецкі. Па матэрыялах іх даследавання ў 1896 г. была выдадзена кніга "Материалы по истории Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии», прадоўжылі даследаванне Адам Кіркор (Варацішын крыж) і граф Канстанцін  Тышкевіч. Іх матэрыялы змешчаны ў кнізе "Вілія і яе берагі". На сённяшні дзень загадкавыя камяні Вілейшчыны даследуюць В.Вінакураў, А.Зайцаў, А.Прохараў, А.Рогач.

Сярод валуноў неабходна адзначыць перш за ўсё Гомсін камень Куранецкі, які знаходзіцца на паўночным усходзе ад Вілейкі. Камень мае даўжыню 5,9 м, вышыню 2 м і важыць 83 т. У 1935 г. камень спрабавалі ўзарваць. З камянём звязана легенда пра шаўца Гомсіну. Замест таго, каб на Вялікдзень пайсці ў царкву, Гомсін вырашыў пашыць дзве пары ботаў. За гэты ўчынак дом Гомсіна быў ператвораны ў камень.

Другі вядомы камень – Лысіна Паца. Дакладных вымярэнняў каменя няма, але існуе легенда. На беразе Віліі стаяў палац, у якім жыў уладальнік Вілейкі – стары і лысы пан Пац. Убачыўшы лодку, Пац крычаў: "Камень! Камень!" Так і ахрысцілі тую рачную ведзьмаватую гару – камень Лысіна Паца.

Добра ведаюць жыхары Вілейскага раёна і камень "Варацішын крыж", які знаходзіцца пасярод в.Камена. Камень мае даўжыню 3,7 м, вышыню – 2,1 м і важыць 40 т.



Репозиторий ГрГМУ

Акрамя валуноў-легенд на Вілейшчыне знаходзяцца камяні-следавікі. Вялікі камень Мішуцкі размешчаны на паўночным захадзе Вілейкі. Ён мае даўжыню 4,7 м, вышыню 1,5 м і важыць 70 т. На вяршыні валуна 84 штучныя паглыбленні дыяметрам 6х7 см і глыбінёй да 3,5 см. Гэтыя лункі былі зроблены каля 2,5–2 тыс. гадоў таму назад. Такія камяні знаходзяць таксама і на тэрыторыі Літвы.

Гістарычную каштоўнасць прадстаўляюць валуны каменныя Сцеберацкія. Гэта пяць камянёў з выявамі рога-рытона і Кола з трохкутнікам або паўкругам на яго вяршыні. Яны знаходзяцца ва ўрочышчы “Сівіха”. Помнік унікальны тым, што на камянях развіваецца вобраз: ні адна выява не паўтараецца. Арыентацыя на поўнач азначае, што выявы звязаны не з рухам Сонца, а з назіраннямі за размяшчэннем паўночных сузор’яў і перш за ўсё Паўночнай зоркі.

Даўгінаўскі каменны крыж, або Каменная мара, – яшчэ адзін вельмі цікавы помнік Вілейшчыны. Ён унесены ў “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”. Крыж мае нестандартны абрыс і ўяўляе сабой выяву чалавека (хутчэй за ўсё жанчыны). На “жываце” жанчыны буйны пакаты знак, які нагадвае выяву дзіцяці.

Большасць даследчыкаў згодны з гісторыкам Гіньцісам Энiньшам (Латвія), што Даўгінаўскі крыж можна аднесці да вогненнага крыжа, крыжа крыжоў, ці крыжа Мары. Мы не можам пагадзіцца з гэтым, так як у беларусаў Мара мела замагільную існасць і звязвалася з нячысцікам. Так лічылі і даследчыкі Г. Драўлянскі і М. Нікіфароўскі. На нашу думку, Даўгінаўскі крыж – гэта не крыж крыжоў, а выява Цёці, якая ўваходзіла ў славянскі пантэон багоў. Крыж прысвячаецца баству, апекаваўшаму жанчын, дзяцей і маладыя сем’і.

Час бяжыць няўмольна. Гістарычныя помнікі разбураюцца. Дзякуючы намаганням Вілейскіх краязнаўцаў, райвыканкам надаў наступным валунам статус асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і аб’ектаў:Вялікі камень “Варацішын крыж”, Камень Любэцкі з ямкамі, Вялікі камень Дворацкі з ямкамі, Вялікі камень Дзядзіцкі, Вялікі камень Івашынавіцкі, Вол каменны Кузьмічоўскі, Гомсін камень Куранецкі, Вялікі камень Лыцавіцкі, Вялікі камень Падсосенскі, Вялікі камень Мішуцкі з ямкамі, Вялікі камень Рускасельскі, Валы каменныя Сцеберацкія, Камень Лысіна Паца, Крыж Каменная Мара (Вывезены ў парк камянёў).

У ходзе даследавання мы прыйшлі да высновы, што спіс неабходна папоўніць новымі камянямі:

- камень на магіле манахіні, забітай падчас Шведскай вайны ў 1665 г.;
- крэсла-камень з маёнтка Дзевятні, на якім любіў адпачываць наш вядомы зямляк-літаратар Ігнат Ходзька;
- крыж каменны з в.Любань;
- камень маршала Пілсудскага з годам (1935) і надпісам “Даў Польшчы свабоду, межы і пашану”.

Рэпазіторый ГрГМУ